23.05.2024 / 07:00 24

Мегаскандал у МУС: супрацоўнік крымінальнага вышуку кіраваў бандай, якая ў балаклавах рабавала дальнабойшчыкаў

КДБ затрымаў супрацоўніка крымінальнага вышуку Докшыцкага РАУС і ўдзельніка

Міхаіла Згірскага. Міліцыянера абвінавачваюць у кіраўніцтве бандай налётчыкаў, пра затрыманне якой на днях адрапартавалі сілавікі.

Міністр унутраных спраў Іван Кубракоў

У справаздачы Міністэрства ўнутраных спраў ад 20 мая 2024 года расказваецца пра затрыманне пяці жыхароў Оршы. Яны абкрадалі фуры на стаянках па ўсёй Беларусі.

> **Пакуль кіроўца спаў у кабіне, злачынцы ўзломвалі замок грузавога адсека, загружалі свой мікрааўтобус крадзеным таварам — ад тэхнікі да харчавання, — і з'язджалі з месца злачынства. Скрадзенае потым прадавалі ў Расіі або карысталіся ім самі.**

Гаворыцца пра шэсць эпізодаў, а таксама згадваецца выкарыстанне рацый і балаклаў.

Затрыманне ўдзельнікаў банды, скрыншот відэа МУС

Але гэта няпоўная інфармацыя, якая прыхоўвае тонкі момант.

затрымання выдалі асобу іншага саўдзельніка, які і зрабіў схему магчымай — праз свой спецыфічны доступ да інфармацыі і веданне метадаў канспірацыі.

> **Як выявілася, кіраўнік банды налётчыкаў — 27-гадовы капітан Докшыцкага крымінальнага вышуку Міхаіл Згірскі.**



Міхаіл Згірскі. У яго ёсць жонка і дзіця. Фота з базы «Кіберпартызанаў»

Паводле інфармацыі «Нашай Нівы», Згірскі не толькі даводзіў удзельнікам банды інфармацыю пра ход расследаванняў крымінальных спраў па здзейсненых эпізодах і прымаў удзел у планаванні рабаванняў, але і сам удзельнічаў у гэтых налётах.


> **У кватэры Згірскага знайшлі іншую, адрозную ад табельнай, зброю, якая фігуравала ў заявах пацярпелых. А таксама адзенне з арыенцірovак і балаклаву.**

Міхаіл Згірскі другі справа. Яго калегі на фота на час праверкі адхіленыя ад службы. Фота: dokshitsy.by

Сам Згірскі родам з блізкага да Оршы Талачына і нібыта даўно знаходзіўся ў адносінах з крыміналізаванымі землякамі.

Крымінальная справа знаходзіцца на асаблівым кантролі ў кіраўнікоў МУС, Следчага камітэта, Генеральнай пракуратуры і КДБ. Іншыя супрацоўнікі

часова адхілены ад службы і правяраюцца на прадмет датычнасці да крыміналу.



Адразу пасля затрымання Згірскага ў раёне нават замянілі міліцэйскае начальства.

Начальнік міліцыі Віцебскай вобласці прадстаўляе новага начальніка Докшыцкага РАУС Вадзіма Гарбузава.

Варта таксама адзначыць, што Згірскі прымаў удзел у палітычных рэпрэсіях, затрымліваючы невінаватых грамадзян за ўдзел у акцыях пратэсту і выказванне нязгоды з рэжымам Аляксандра Лукашэнкі.

«Наша Ніва» — бастыён беларушчыны

ПАДТРЫМАЦЬ

Nashaniva.com

Хочаш падзяліцца важнай інфармацыяй ананімна і канфідэнцыйна?

Пішыце рэдактару «Нашай Нівы» ў ТГ

ПАДЗЯЛІЦЦА

ЧЫТАЙЦЕ ЯШЧЭ

Завочны суд над Франакам Вячоркам пачнецца ў апошні дзень вясны

Лявон Вольскі прэзентаваў кліп «Куды і калі» ВІДЭА 2

Блок Азарава знялі з выбараў у Каардынацыйную раду 14

КАМЕНТАРЫ

Алесь Нязгода/адказаць/ 5 0
23.05.2024

вы што хатіте штоб девяностые вернулісь, кагда мы фсе в лаптях хаділі і разгул бандітізма был?

гердзень /адказаць/ 4 0
23.05.2024

а што тут дзіўнага? бандыты яны і ў пагонах застаюцца бандытамі. тут пасьля затрыманьня трэба наверх яшчэ і сам кдб затрымаць, толькі шкада няма кім пакуль

Из народа вышел /адказаць/ 1 0
23.05.2024

Мелочь, что здесь обсуждать?

ПАКАЗАЦЬ УСЕ КАМЕНТАРЫ

ІМЯ

Націсканьне кнопкі «Дадаць каментар» азначае згоду з рэкамендацыямі па абмеркаванні.

Спам-фільтр: падлічыце, колькі будзе...



не бачу сімвалы

ДАДАЦЬ КАМЕНТАР

Былы афіцэр унутраных войск: Я быў камандзірам групы, якая перасаджвала бульбу ў рэзідэнцыі Лукашэнкі 3

Расійскі рэгіён вярбуе беларусаў на вайну праз сацсеткі — наладзілі таргетаваную рэкламу 1

У Беларусь прыляцеў самалёт Януковіча 1

Пуцін гатовы спыніць вайну на сённяшняй лініі фронту — Reuters 5

Сярэдні заробак у Беларусі вырас на 21 рубель 1

Байдэн прапусціць саміт міру па Украіне ў Швейцарыі. Ён

мерапрыемствам па зборы грошай у Каліфорніі 5

Наступныя як мінімум 10 дзён у Мінску будзе да +28°C 1

Мядзведзь з Беларусі падарыў сабе кароткі адпачынак у Еўрасаюзе 1

Як правільна сказаць: «У Іўі ў яе ё я»? 2

Лявон Вольскі прэзентаваў кліп «Куды і калі» ВІДЭА 4

Блок Азарава знялі з выбараў у Каардынацыйную раду 26

Памёр знакаміты сабака-мем 1

Азараў адмовіўся здымацца з выбарчай гонкі ў Каардынацыйную раду 17

Звольнілі кіраўнічку «Харошак», што кіравала ансамблем 50 гадоў

Мегаскандал у МУС: супрацоўнік крымінальнага вышуку кіраваў бандай, якая ў балаклавах рабавала дальнабойшчыкаў 24

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч перанёс інфаркт 1

Беларусь экстрадзіравала грамадзяніна Літвы, які быў у вышуку Інтэрпала

Крышціяну Раналду можа

Кіраўнік Мінлясгаса загадаў, каб ляснічым плацілі 3 тысячы рублёў чыстымі 4

Пуцін спусціўся з самалёта да Лукашэнкі па куленепрабівальным трапе ФОТАФАКТ 16

У бацькоў віцебскага журналіста Аляксандра Корнышава зноў правялі ператрус

Беларусь адправіць у Расію гуманітарную дапамогу 1

Даляр сёння апусціўся ніжэй за 3,2 рубля

Мінчука адправілі на суткі за БЧБ-

Завочны суд над Франакам Вячоркам пачнецца ў апошні дзень вясны


СТУЖКА НАВІН

КАЛЯНДАР

2023 2024 2025

Красавік Май Чэрвень

ПН	АЎ	СР	ЧЦ	ПТ	СБ	НД
		1	2	3	4	5
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19



20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30	31		

PDF ВЕРСІЯ

Здарэнні
Свет
Спорт
Аўто
Меркаванні
Ад рэдакцыі
Архіў
Блог "Новая Беларусь"
Вайна

Здарэнні

Здароўе

Кіно
Літаратура
Культура
Тэатр

Навука і тэхналогіі

Спорт

Аўто

Каханне і сэкс



КАНТАКТЫ

PRAS.by Дызайн сайта — арт-студыя PRAS

© Усе правы абароненыя. Выкарыстанне платных матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных рускамоўных версій матэрыялаў забаронена без пісьмовага дазволу. Выкарыстанне бясплатных беларускамоўных версій матэрыялаў дазваляецца пры ўмове наяўнасці актыўнай гіперспасылкі на Nashaniva.com у першым абзацы.

